Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

# ПА СТАРОНКАХ ПАМЯЦІ…

Хрэстаматыя

Мінск
БДУКМ
2024

УДК 811.161.3+821.161.3
ББК 81.411.3-553
ББК 84(4Беи)
П12

Укладальнікі:
*А. М. Пісарэнка, І. В. Мантачык, В. В. Шунейка*

Рэцэнзенты:
*кафедра* рускай мовы як замежнай установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
*В. П. Русак,* доктар філалагічных навук, дацэнт, загадчык аддзела сучаснай беларускай мовы філіяла «Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа» Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі

П 12 **Па старонках памяці…** : хрэстаматыя / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; уклад.: А. М. Пісарэнка, І. В. Мантачык, В. В. Шунейка. – Мінск : БДУКМ, 2024. – 62 с.
ISBN 978-985-522-366-6.

Хрэстаматыя па вучэбнай дысцыпліне «Стылістыка і культура маўлення» складаецца з літаратурных твораў удзельнікаў літаратурнай суполкі «БУКет», уключае работы студэнтаў і супрацоўнікаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый.

Адрасуецца студэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

**УДК 811.161.3+821.161.3**
**ББК 81.411.3-553**
**ББК 84(4Беи)**

**ISBN 978-985-522-366-6**

© Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», 2024

## ЗМЕСТ

**Прадмова.** *А. Пісарэнка* …………………..……………….. 5

**Віншавальнае слова.** *В. Варапаева* ……………………. 7

*Аляксандраў Віктар* ………………………………… 8

*Багамолава Алена* ……………………………………… 10

*Балкоўскі Андрэй* ……………………………………… 12

*Бігеза Валянціна* …………………………………….. 15

*Варапаева Валянціна* ………………………………... 16

*Вялікая Ганна* ……………………………………….. 18

*Герман Аляксей* …………………………………….. 21

*Грыгаровіч Кацярына* ………………………………. 22

*Грынюк Вадзім, Лагойкін Аляксандр* ………………… 25

*Даніленка Любоў* ……………………………………. 26

*Дзямешка Лілія* ………………………………………. 28

*Зязюліна Дзіяна* ……………………………………... 29

*Іваноў Мікалай* ……………………………………… 30

*Карпей Яўгенія* ……………………………………… 31

*Клімаў Ігар* …………………………………………... 33

*Кухальская Ангеліна* ………………………………… 35

*Лукшыц Аляксандр* …………………………………….. 36
*Майсеенка Анатоль* ………………………………… 38
*Макееў Павел* ……………………………………….... 39
*Максіменка Юрый* ……………………………………... 40
*Махнач Максім* ……………………………………… 42
*Рабцава Ірына* ………………………………………. 43
*Рачынскі Юрый* ……………………………………... 46
*Ржэуцкая Улада* …………………………………….. 48
*Чарнагалава Вера* ………………………………… 50
*Шабовіч Мікола* ……………………………………... 52
*Шабор Сафія* ………………………………………... 53
*Шарова Ульяна* ……………………………………… 56
*Шунейка Вольга* …………………………………….. 58
*Шут Паліна* ………………………………………… 60

## Прадмова

Юбілей – гэта заўсёды свята, нягледзячы на тое, колькі гадоў чалавеку, з’яве, падзеі… Юбілей – гэта заўсёды ўспаміны, радасныя і сумныя…Юбілей – гэта час падводзіць вынікі і планаваць, каб рухацца далей… Факультэту інфармацыйна-дакументных камунікацый – 80 год! Гэта адназначна нямала, і гэта вялікае свята, паколькі шмат зроблена, але яшчэ колькі неабходна зрабіць!

На факультэце не толькі любяць і шануюць кнігу, тут пішуцца і ствараюцца розныя крыніцы ведаў, у тым ліку і мастацкія. Пры кафедры беларускай і замежнай філалогіі ў кастрычніку 2001 года было створана літаратурнае аб’яднанне, якое самі студэнты нашага факультэта вызначылі як «БУКет». Тры першыя вялікія літары сімвалізуюць назву нашага ўніверсітэта на момант стварэння гуртка – Беларускі ўніверсітэт культуры. Рос, мацнеў, змяняўся ўніверсітэт, а разам з ім факультэт і як неад’емная яго частка «БУКет». Вынікам працы аб’яднання сталі 13 зборнікаў вершаў і прозы: «БУКет», «Акварэлі», «Завіруха кропель», «Каліва», «Кветка ў мегаполісе», «Дар зямны», «Весніцы», «Світальныя словы», «Ляці Вышэй!», «Вітаю цябе, Натхненне!», «Жыву…», «Апошні дзень лета», «Ад слова да зместу» і гэты зборнік, які вы трымаеце ў руках, – «Па старонках памяці…». Кожная назва створаная, выпеставаная асацыяцыямі маладых аўтараў, сярод якіх – студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі ўсіх факультэтаў універсітэта.

Літаратурная творчасць была і застаецца адной з магчымасцей рэалізацыі здольнасцей асобы, яе творчага, нестандартнага асваення рэчаіснасці, спасціжэння свету. Лёгка і адначасова няпроста ўбачыць у пялёстках кветкі – крылы, у вачах – ззянне зор, у моцным дажджы – завіруху кропель, у лістах, што зрываюцца з дрэў бязлітасным ветрам, – хвалі, у акварэлях – фарбы, якімі малюе душа і г. д. Той, хто сапраўдны творца, ён мысліць вобразамі, адчувае сэрцам. Твор нараджаецца тады,

калі сэрца аўтара б'ецца ва ўнісон з подыхам ветру, з ноткамі голасу маці, каханага, смеху дзіцяці, з шапаценнем лістоў і пялёсткаў белапеннага язміну каля роднага ганка, з першым гудком ранішняга трамвая…

Сённяшні зборнік нас сапраўды правядзе па старонках памяці: у паэтычнай форме мы прыгадаем тых, хто ствараў факультэт, тых, хто вучыў студэнтаў, пісаў падручнікі і… вершы, прозу. Нам радасна, што яны былі, што мы можам сёння чытаць іх творы ці творы, прысвечаныя ім. Жыццё няспынны рух – такая яго логіка – прыводзіць на факультэт, ва ўніверсітэт новых творчых асоб, таму словы шанавання і віншавання ў зборніку – і ад моладзі.

Творчымі не становяцца – творчымі нараджаюцца! – сцвярджаюць выкладчыкі кафедры беларускай і замежнай філалогіі факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый самага творчага ўніверсітэта краіны. Уявіце сабе, што бібліятэкары, мастакі, рэжысёры, музыкі, спевакі, менеджары і інш. не толькі спяваюць, малююць, танцуюць і г. д., але і пішуць апавяданні, вершы, песні, казкі на высокім мастацкім узроўні.

«БУКет» віншуе з юбілеем факультэт, на якім вывучаецца і ствараецца кніга, – уласнай кнігай! Шчырыя словы падзякі тым, хто далучыўся да яе стварэння: кіраўніцтву ўніверсітэта, дэкану ФІДК, аўтарам і кафедры. Жадаем усім творчасці і плёну, факультэту – высокіх дасягненняў!

*А. Пісарэнка*

## Віншавальнае слова

Гэты невялікі зборнік твораў – знак павагі факультэту ІДК, на якім звыш 20-ці гадоў таму назад, з благаслаўлення кіраўніцтва факультэта, была створана пры кафедры беларускай філалогіі творчая суполка «БУКет». І факультэт, і кафедра былі адносна маладыя. А сёння ІДК адзначае сваё 80-годдзе. Цяжка паверыць, але гэта так! Колькі цікавых і цікаўных таленавітых маладых людзей набылі тут неабходныя спецыяльнасці, сталі прафесіяналамі, а тыя, хто ўдзельнічаў у гуртку, – сапраўднымі творцамі. Даўно вядома, што чалавек, які прычасціўся творчасцю, зусім іншы чалавек. Ён пільна ўглядаецца ў жыццё, востра рэагуе, ён неабыякавы, накіраваны на стваральнасць.

Факультэт істотна змяніўся: з'явіліся новыя, адпаведныя часу спецыяльнасці, запатрабаваныя прафесіі, а «БУКет» – застаўся, ён жыве! І ў яго суполку прыходзяць разумныя, таленавітыя, непадобныя ні на кога, маладыя людзі. Яны шукаюць свой шлях, сваю сцяжынку. Пагартайце, прачытайце творы з розных зборнікаў «БУКета» – і вы атрымаеце вялізнае задавальненне, творчы ўздым.

Маладыя аўтары пішуць на самыя разнастайныя тэмы, у розных жанрах. Не ўсе, вядома, стануць пісьменнікамі. Але гэта людзі, якія разумеюць мастацтва ва ўсіх яго праявах.

Дзякуй, любімы факультэт, што падтрымаў іх тады, падтрымліваеш зараз. Яны не падвядуць!

Са святам!

*В. Варапаева*

*Аляксандраў Віктар*

## Я НЕ КІНУ

Кожны дзень я чакаю, што будзе з намі далей.
Маё сэрца ў далонях і для вашых вачэй.
Хто ж ты, хто ж я – страціў накірунак.
Я лячу, як шар, у атмасферу над зямлёю з лунак.
Кожны дзень я чакаю, чакаю лепшы час,
Але навокал міражы – я не знайду адказ.
Я ў палоне думак, што цягнуць на дно:
Ці хопіць мне моцы, каб стрымаць іх вабнае цяпло?
Як нам жыць сярод глухіх, утапічных жаданняў,
Завышаных чаканняў, розных меркаванняў?
Кожны хоча быць лепшым, лепш, чым ён ёсць,
Але хто ў гэтым свеце гаспадар, хто госць?
Калісьці я верыў, што буду тым, хто вядзе,
І буду тым, хто можа крочыць па вадзе.
Як жа многа гонару, дарэчы, было і прайшло.
Я не святы, але ж трымай маё святло…

Я не кіну,
Я шаную
Тое, што ёсць.
Я не загінуў.
Я спрабую
Стаць лепшым,
Але я толькі госць.
Я не кіну,
Я шаную
Тое, што ёсць.
Я не загінуў.
Я малюю
Сваё сэрца табе!

Я кручу глобус, я шукаю, але
Не знойдзеш на маленькай копіі Зямлі  мяне.
Немагчыма выявіць ні спутнікам, ні мікраскопам

Азімут, па якім я блукаю аўтастопам.
Як так адбылося, што не маю месца,
Дзе не было б мне душна, дзе не было б мне цесна.
Я чалавек? Ці іншапланецянін?
Мабыць, кожны з нас бывае
На зямлі, як марсіянін.
Вечныя пытанні пра каханне і пра сэнс жыцця…
Сваю праўду знойдзем, як яе знаходзіць дзіця.
Але трэба даказаць яе ўсім на злосць.
Хіба гэта наша любоў, турбота і цяпло?
Я не ведаю, дзе праўда, дзе хлусня, але
Я бачу шмат, і шмат да глыбіні кранае мяне.
Мае бясконцыя думкі, як тысячы рэк,
Дапамагаюць зразумець, што я яшчэ чалавек!

*Багамолава Алена*

***

Адкрываецца Душа – Богу,
Зямля – Млечнаму Шляху,
Святло – Дню,
Цемра – Ночы,
Пачатак – Бясконцасці…
Дзверы – Вандроўніку і Каханаму…

***

Жоўты антон,
Наліўны, сакаўны,
На галінцы бязлістай вісіць.
Сонца ў шэрым
Восеньскім садзе, –
Жоўты антон.

***

Восень-фея малюе фарбамі лета,
Нібы рыхтуе верасню, кастрычніку
І лістападу
Агромністую карэту.
Паважныя
Гарбузы і гарбузікі,
Аранжавыя, жоўтыя і зялёныя, –
Восеньскія лежабокі.
Навошта ім кідацца ў скокі –
Стануць яны карэтай!..
Восень-фея малюе фарбамі лета.

***

Кошык восені
Не нацешыцца апенькамі
І вялікімі, і маленькімі.
Дружная карычневая сямейка
Скача
Ў кошык восені.

***

Усю ноч
На карнізе маім дождж
Выбівае стэп
Босымі ножкамі.
А пад раніцу восень
Жоўта-шэраю кошкаю
Пасылае лісты сонцу.
Усю ноч
На карнізе маім дождж.

***

Бракуе часу.
Часу не стае.
І рыфму не спаймаць.
Не запісаць
радкі мае...
**в**осень...
**в**ерасень...
**в**ершы...

**в**окны...
**в**ера...
**в**яртанне...

...**в**ясна.
**в**ецер...
**в**усны...

Ці пусціш да сябе,
Ці пусціш?...
Каб дапісаць радкі,
Каб вусце
Жыцця-ракі
Не абмялела.
Бракуе часу, бракуе фарбаў –
Малюю белым!

*Балкоўскі Андрэй*

**Найперш было Слова**

Яны стаялі амаль без руху адзін насупраць другога. Цягнік жа рухаўся сваім кірункам, праязджаючы глухія вёскі і, здавалася, паўпустыя гарады. Увесь шлях іх абодвух суправаджаў малады серпападобны месячык, які напускаў у тамбур скупое святло. Хлопец стаяў крыху адхіліўшыся і паліў цыгарэту. Маленькі агеньчык зрэдчасу ўспыхваў на самым яе канцы, але гэта не мела ніякага дачынення да размовы.

– Даруй, што адразу пераходжу на «ты», але ж ці можаш ты адказаць на пару маіх пытанняў? – спытала дзяўчына.

– Залежыць ад таго, што цябе цікавіць.

Яны не маглі разгледзець адзін аднаго ў гэтым цьмяным тамбуры.

– Я чула, як ты дакладна цытаваў вершы… Вось гэта: ды ёсць яшчэ прастор далёкі… – сцішылася. Магчыма, жадала пачуць працяг, але яго не адбылося: – Адкуль такія веды? Такія думкі і памкненні?..

Хлопец спрабаваў угледзецца ў дзявочы твар, але не бачыў асабліва нічога, акрамя яе доўгіх чорных валасоў пад шэрым, магчыма, капялюшыкам ці, можа, капюшонам… Яна стаяла не ў самым удалым месцы, святло зусім не трапляла ў яе куток.

– Мне проста падабаецца. Адразу знаходжу кагосьці выключнага з усяго натоўпу людзей, інтуітыўна адчуваю цікавае... Бач, і цябе сустрэў…

– Як тваё імя?

– О, не… – гмыкнуў. – Не дзеля гэтай мэты.

– Чаму?

– Разумееш, больш за ўсё ў размове мяне прываблівае эксперымент. Няма што сказаць пра маё імя, затое ёсць што пра вунь тыя змрочныя вёскі, напрыклад, ці, увогуле, пра гэтую ноч. – Ён да ўсяго яшчэ зрабіў два жэсты рукой, у якой трымаў цыгарэту. Спачатку ў бок акна, затым – уверх...

– Ці ёсць табе што сказаць пра гэтую ноч?

– Настае час іншабыцця. Пакуль мы едзем, дзесьці нам будуюцца масты, а дзесьці ўзнаўляюцца старыя дарогі… Усё гэта адбываецца зараз – ноччу, пакуль усе спяць, каб раніцай людзі прачнуліся ў крышачку іншым свеце ці сусвеце і заўважалі

змены паступова. Мы з табой – адзіныя сведкі мінуўшчыны і адначасова назіральнікі заўтрашняга. Без гэтага шляху яно б ніколі не ўкаранілася б у чалавечых сэрцах.

– Надзвычай паэтычна размаўляеш, я бачу, што паэзія паўплывала на цябе вельмі станоўча. Але дазволь, няўжо чалавечыя адносіны зусім не кранаюць тваю душу?

– На іх прыйшлося б аддаць яшчэ больш. Усёй ночы не хопіць, каб распавесці пра тое, аб чым размаўлялі стагоддзямі да нас. Чалавечыя адносіны з маімі суразмоўцамі – гэта цяжар.

– Ты мэтанакіравана іх абыходзіш?

– Ведаеш, нядаўна я адчуў у сабе магчымасць адшчапіцца ад соцыуму і цалкам аддаць сваё жыццё творчаму подыху, волі, мастацтву. Вось пагэтаму паэзія і пагэтаму мы зараз тут.

– Калі гэта было б так, ты б не шукаў мяне, не гутарыў бы са мною.

– Так, бо я ўжо даўнавата еду ў гэтым цягніку, шмат палю, а доўгачаканы ранак ўсё ніяк не настае. Я разважаў наконт розных варыянтаў, чаму так адбываецца, і ў выніку не змог супрацьстаяць рэальнасці самастойна. У тваёй асобе я бачу падтрымку.

Ён працягваў глядзець на дзявочую постаць. Доўгае шэрае паліто закрывала сабой тонкае цела і прыемную талію. Дзяўчына пераступала з нагі на нагу. На нагах яе былі чорныя боцікі.

– Што ж цябе кранула ў маёй асобе?

– Пакуль не ведаю сам. Калі быць дакладным, упершыню я даходжу да такой адкрытасці з кімсьці. У мінулыя разы мы стаялі моўчкі хвілін дзесяць, на тым ўсё і канчалася. Але і гэта было часткай эксперыментаў.

– Ты выглядаеш крыху збянтэжана зараз. Эксперымент адхіліўся ад запланаванага курсу?

– Мо і цягнік сышоў з запланаванага шляху...

Ва ўзніклай цішыні стала добра чуваць манатонныя ўдары колаў аб рэйкі.

– І ўсё ж, давай паспрабуем рухацца ў гэтым кірунку да самага канца. Хочаш, раскажу табе крыху пра сябе. Я вучылася ў БДУ на філолага, бо, як і ты, разумею, што ў тых краявідах за акном насамрэч б’ецца, пульсуе, ствараецца жыццё, але найперш было *Слова*. Пасля заканчэння ўніверсітэта села на гэты

цягнік і вось усё яшчэ жадаю адчуць трапяткое гуканне сонца. А можа быць, каханне…

Хлопец асцярожна варухнуў твар у яе бок. Цыгарэта была ўжо выпалена. Баючыся  і ўглядаючыся, ён усё ж такі зрабіў крок наперад.

– Ну вось, цяпер я бачу цябе! – куточкі яе вуснаў прыўзняліся. – Як тваё імя?

– Костусь.

Твар дзяўчыны пасвятлеў і прасвятлеў аднačасова. Шэры капялюш стаў бэжавым, валасы – бялейшымі, а постаць набыла нябачныя дагэтуль выгіны.

Костусь азірнуўся і ўбачыў першыя зіхоткія прамяні сонца, і яны нібы пісалі на гарызонце радкі.

*У гэтым свеце. Гэтым дзіўным свеце,*
*Сустрэцца выпадае толькі раз.*
*Зірні, як зоркі мігатліва свецяць,*
*Яны таксама разумеюць нас.*

*Бігеза Валянціна*

## ВЫКЛАДЧЫКАМ

Бягуць гады – мы ўсе сталеем.
Ўжо трэба юбілеі адзначаць,
Але душой і сэрцам не старэем,
І кожны год нам толькі дваццаць пяць.

Прыемна бачыць ўсмешлівыя твары,
Чуць віншаванні цёплыя сяброў
І адчуваць, як вераснёўскі ранак
Вяртае у юнацтва зноў.

Так будзе вечна, покуль мы жывыя.
А іншага й не трэба ў жыцці,
Бо мы, выкладчыкі, заўсёды маладыя,
І толькі, маладым, наперад нам ісці.

*Варапаева Валянціна*

***

Восемдзесят год…Гэта многа ці мала?
Столькі з той страшнай вайны мінавала.
Скупая сляза ветэрана,
Боль успамінаў…
Можа забыць усё?
Каб сэрца не рвала,
Душа не пакутавала і не стагнала!
Полк бессмяротны
Ідзе па планеце,
У неба сягае –
на-па-мі-на-е!!!
Людцы, глядзіце: усе мы
жывыя,
Вочы не выцвілі –
мы маладыя!
Мы аддалі вам планету зямную:
мірную, любую, дарагую. –
Беражыце яе!
Полк бессмяротны
Ідзе па планеце,
У неба сягае –
на-па-мі-на-е:
Душы ратуйце! Пільнымі будзьце!
Нас не за-бу-дзь-це!

## ЖАДАННІ

Так хочацца прачнуцца ранкам,
Каб певень разбудзіў.
Ласкавы сонечны праменьчык
У вясковае аконца засвяціў.
Пачуць матулін голас:
«Уставай, дачушка,
Не праспі дзянёк…».
Убачыць тату, брацікаў, сястрычку,
Адчуць сябе маленькай у сям'і.
Пабегаць басаnож каля Жадунькі
Ахутанай чаромхай
З двух бакоў.
І буслам белым падзівіцца,
Які шпацыруе ў чырвоных ботах
Па полі аржаным.
Мой родны край,
Мая маленькая радзіма!
Ты снішся рэдка,
Але так яскрава!
Я застаюсь часцінкаю тваёй,
А для мяне навек ты Храмам!

## ПЕРВАЯ КНИГА

Тонкие девичьи пальцы касаются плотных белых страниц бережно, почти ласково. Скользят вверх. Строчка за строчкой – вдумчиво, спокойно. Эта книга для Эли особенная. Не потому, что новая, еще неизведанная, полная тайн и загадок. Потому что она другая. Не для всех. Такая, как сама девушка. Вместо ровных строчек текста – тонкая нить рельефно-точечных оттисков, вместо рисунков – соцветие объемных линий на выпуклой странице. Обычному человеку сложно будет увидеть за скоплением точек буквы, складывающиеся в слова. Эля же видит в них целый мир. Во всех смыслах.

Это первая книга, которую она прочтет сама. Особенная книга, несущая в себе целую вселенную. Неизведанную, полную удивительных вещей и интригующую самим своим существованием. Девушка знает, что солнце желтое и горячее, но не знает, что такое *желтый*. Вода в ручье прохладная и прозрачная, мама добрая и красивая, а ее любимый котенок рыжий и пушистый. И если осязанием она может это почувствовать, понять, то абстрактные описания теряют всякий смысл. Может, книга откроет ей ту сторону мира, что скрыта за плотной темной пеленой?

Строчка за строчкой. Простые точки расцветают в сознании не только цветами. Они географическими картами складываются в города и страны, картинами экспериментов и опытов объясняют естественные науки, сплетаются причудливо в чужие истории и судьбы. За, казалось бы, не самой сложной системой знаков скрывается все величие человеческих знаний, накопленных за многие-многие годы.

То, что раньше представлялось далеким, чужим и непонятным, сейчас было на расстоянии вытянутого пальца. Это будто шагнуть в портал, ведущий в мир науки и искусства. Он поглотит тебя, закрутит подобно водовороту и не отпустит, не насытив ум и сердце, которые столько лет жаждали знаний, искали ответы на свои вопросы, которые не мог дать простой человек.

Желтый цвет стал теплым солнечным лучиком, который норовит первым разбудить утром, застенчиво скользнув сквозь шторы. Прозрачный стал вкусом ледяной воды в знойный засушливый полдень. Рыжий стал мурчащим клубочком в руках. Красота мамы стала удовольствием от момента познания мира, который она тебе подарила, который готова открывать для тебя каждый день во всех его проявлениях.

Строчка за строчкой. Постигать тайны, узнавать что-то новое, создавать нечто свое.

Строчка за строчкой. Эля наконец видит мир.

***

За плечами лет немного,
Волосы черным-черны,
Не протоптана дорога
В свете солнца и луны.
И седин ещё нескоро
Нам с тобою ждать в висках,
И работаются споро
Все дела в твоих руках.

Юность, молодость – раздолье
Для любви и для души.
Мир растлался, словно поле
В зимней стуже и тиши.
И бежишь ты без оглядки,
Словно крылья за спиной,
Со Жнецом играя в прятки
До преклонности седой.

***

Мы пойдём с тобой
Вдвоём за мечтой –
Под дождём босиком,
По радуге – вдаль.
Поднимаясь все выше,
Гуляя по крышам,
Забывая про то,

Что такое печаль.
Полетим к облакам,
Не зная, что там,
Станцуем с Луной
Непременно с тобой.

Мы спустимся вниз,
Присев на карниз –
Мы вернулись домой
За новой мечтой.

*Герман Аляксей*

## ПАЗЫКА

Яшчэ хвілінка, яшчэ дзянёк
Мае грудзі будуць уздымацца.
Вялікага ценю малы цянёк
Ля акна майго пачаў хавацца.

Іграе музыка. Гучны бас.
І гучаць наўкол апладысменты.
Бы водар хвоі прыносіць час
«…Sacramento, uno sacramento»*.

О, каб не слухаць мне гэты плач,
Я табе салодкай долі зычу.
Малю да Бога, мне прабач,
Што свае гады табе пазычыў.

***

Каханне скруху праўдзіць пакрысе,
Любоў жа вабіць мроямі.
Люблю, кахаю, пэўна, як і ўсе…
Пачуцці ўе жыццё сувоямі.

Маіх не разумееш, можа, слоў,
Гучаць што «мёртвай мовао».
Табе мо падаецца гэтая любоў
Праклёнам ці замовао?..

Няма дазволу мне цябе кахаць,
Любіць цябе – не забаронена.
Каханне гэтае не можа існаваць…
Любоў – шчыміць нібы аскоміна…

---

* (італ.) – Таемства, адно таемства.

*Грыгаровіч Кацярына*

# ПОДЗВІГ

На ўскраіне вёсачкі Журавінаўка стаяў вялікі дом. Там, за печкай, салодкім сном спаў малы хлопец Ціма. Нічога не прадракала бяды, пакуль яго братачка Данька не падзьмуў у музычны інструмент. Ад гэтага кепскага свісту разбегліся коткі, якія мірна спалі пад ложкам. Ціма спалохаўся і, хутка намацаўшы на стале акуляры, ашаломлена зірнуў на светлавалосага хлапчука ў белай футболцы і яркіх жоўтых шортах.

– Ты што, не чуў выраз – труба кліча ? – весела адазваўся той. Хлапчук моцна сціскаў у руцэ пластмасавы прадмет і ўсё чакаў моманту ім зноў скарыстацца.

– Перш, чым я закрычу ад жаху, проста скажы, навошта? – Ціма быў вельмі незадаволены выхадкай свайго брата.

Пасмяяўшыся, Данька нахіліўся да яго і насмешліва вымавіў:

– Лічы, што гэта наглядная дэманстрацыя.

– Тады зразумеў, – набраўшы ў лёгкія пабольш паветра, хлапчук заверашчаў што ёсць сілы.

На крык пляменніка прыбегла цётка Зіна.

– Чаго ты лямантуеш? – здзівілася цётка. – Сходзіце, прагуляйцеся лепш! А то ўсё лета прапусціце.

Праз некаторы час хлапчукоў сустрэў цудоўны лес.

У небе ленавата плылі аблокі, а зялёныя дрэвы ледзь хісталіся ад прыемнага цёплага ветрыку. Чуць, як спяваюць птушкі, і недзе ўдалечыні бурліць рэчка. Браты ўжо не раз прагульваліся тут, але зараз Ціме было не да прагулак. Пазяхаючы, ён сонна пераплятаў нагамі і павольна спрабаваў паспець за трубачом.

– Як ты мог забыцца? – падскокваў малодшы, размахваючы новай музычнай цацкай. – У нас жа сёння запланаваны подзвіг! На дванаццаць гадзін.

– Я памятаю, – пазяхнуўшы ў чарговы раз, прамовіў цёмнавалосы хлапчук і пасунуў акуляры да пераносся, – але зараз дзевяць раніцы.

– Вось ты смешны які! А падрыхтавацца? – зазіраючы ў пустое дупло дрэва, прамовіў Данька. – Подзвігі – яны, ведаеш, на дарозе не валяюцца. Час зараз такі, не вельмі рыцарскі.

Пачухаўшы патыліцу, хлапчук агледзеў палянку ў пошуках чагосьці гэтакага. Яму хацелася хутчэй знайсці той самы аб'ект для подзвігу. Але, як на зло, ні адна вавёрка або заяц не траплялі ў непрыемнасці.

– Для сапраўднага подзвігу заўсёды ёсць нагода! Тут галоўнае – не ўпусціць момант… – бадзёра крочачы па сцежцы, Данька вырашыў азірнуцца на свайго брата. Той абапёрся на ствол дуба і, прыкрыўшы вочы, стаў мірна пасапваць.

Данька яхідна ўсміхнуўся і, падышоўшы бліжэй, зноў затрубіў што ёсць моцы. Спалохаўшыся, Ціма выпрастаўся і пацёр вочы пад акулярамі.

– Глядзі ва ўсе вочы, Ціма, – паляпаўшы па плячы старэйшага брата, усмешліва сказаў хлапчук.

Ціма праз хвіліну шырока расплюшчыў вочы і заўважыў нешта нядобрае:

– Данька, там гарыць! – паказваючы ў процілеглы бок пальцам, ён прыцягнуў увагу да куста, які быў ахоплены агнём.

Зрабіўшы некалькі крокаў у бок полымя, хлопчыкі задумаліся. Полымя пачало прасоўвацца па паляне, захопліваючы таполевы пух і сухія галінкі.

– І што? – сказаў малодшы. – Гарыць і гарыць. З сухой травой такое бывае.

– П…п… Пажар – гэта не добра, – канчаткова прачнуўшыся, насцярожыўся Ціма.

– А гэта не наша справа. Не мы ж вінаватыя. Не мы, – размахваючы трубой, усхвалявана паўтараў малодшы. Прыгледзеўшыся, ён утаропіў рукі ў бакі. – Ды і пажар нейкі дробны. Ціма, пайшлі, у нас справы, калі ты забыўся, – нібы салдацік, Данька прыўзняў сваю трубу і адышоў, як маршалак, ад кусціка. – Нас чакаюць сапраўдныя подзвігі! А не нейкія там недапажары.

– Мы павінны пра гэта расказаць! – паправіўшы акуляры, хлапчук пабег прэч з лесу ў пошуках падмогі.

– Ціма… – крыкнуў Данька наўздагон брату.

А тым часам агонь пачаў разыходзіцца па паляне, пераходзячы на ствол дрэва. Лясныя жыхары перапалохаліся і сталі ўцякаць прэч ад небяспекі. Птушкі пачалі адлятаць далей ад густога дыму.

– Куды вы, звяркі? Я вам дапамагу! – Данька стаў глядзець па баках у пошуках чагосьці, што можа яму спатрэбіцца.

Аднак не паспеў Данька апамятацца, як прыбеглі бацькі і суседзі з ягонай вёскі з вёдрамі вады. Людзі згуртаваліся, і ім удалося справіцца з агнём.

– Яшчэ трохі – і ўвесь лес захапіла б, – сказаў дзядзька Слава, прыбіраючы з ілба кроплю поту.

– Дакладна! Агонь патушылі маленькі, а лес выратавалі вунь які вялікі! – працягнуў дзед Кірыл, азіраючыся вакол.

– Ты, Ціма, правільна зрабіў, што паклікаў нас! – дзядзька лягенечка тузануў за нос Ціму, а пасля ўскалмаціў яго валасы.

– Так, гэта і ёсць сапраўдны подзвіг! – ухваліў дзед, аглядаючы ўнукаў.

Пасля яго слоў Данька здзіўлена паглядзеў на Ціму і, пачухаўшы патыліцу, так і не змог нічога сказаць.

– Сам у шоку, – нарэшце ўсміхнуўся старэйшы.

– Нішто сабе! – здзівіўшыся, прамовіў Данька і ўрачыста перадаў трубу брату.

Ціма, усміхаючыся, ганарліва падняў угору свой трафей.

Бо не трэба быць вялікім, каб здзяйсняць подзвігі! Досыць у патрэбны момант папрасіць дапамогі, інакш аднаму будзе складана выратаваць цэлы лес ад пажару.

*Грынюк Вадзім*
*Лагойкін Аляксандр*

***

Паміж пяскоў і балотных ялін,
Дзе водар кветак і бэзу пах,
Шмат стагоддзяў, а можа, хвілін,
Палюе кароль Стах...

Лунае ў нябёсах высока сцяг,
І конь хапае балотны пыл.
Я тут нарадзіўся, і я тут жыў –
Вітае  нас кароль Стах.

І будзе табун скакаць па раллі
І ўдзень, і ўноч, свой згубіўшы шлях, –
Сівая легенда маёй зямлі –
Не забыты кароль Стах.

*Даніленка Любоў*

## ВЯЗЫНКА

Сюды,
дзе распраўляюць годна плечы старадаўнія дубы,
дзе ў жаўцізну і барву клёны апранаюцца увосень,
дзе кожнаю вясною ў карагодах карагодзяць «я» і «мы»,
дзе гнуцца – не здаюцца пад наваламі вятроў з усіх бакоў
ствалы маўкліва-летуценных дрэў,
дзе з аднаго, нібы гнязда, камля-карэння
у неба мкнецца
сем ствалоў,
наўкол якіх шмат іншых, што растуць тут так – сямейна,
схіляючыся кронай-галавою адзін да воднага
у спёку й слоту
і абдымаючы і малодай, і кручкаватай састарэлай галіной-рукою
ўсялякага, хто лёсам жыць наканаваны побач,
сюды,
да родных векапомных камянёў,
дзе пецярнёй кляновага ліста
аблашчана уся наўкол замшэлых і зсівелых валуноў зямля,
дзе яблыневы сад
скідае ноччу ў цішыці свае дарункі,
каб наталіць-зачараваць духмяным –
ад зайцоў, ці прашчураў – сардэчным пачастункам,
дзе людзі суцяшаюцца цяплом, святлом і даўніною,
дзе ёсць Купалы дух са мною...

Сюды
мая душа заўжды імкнецца,
адсюль
натхненне жыць
бярэ штодня і сэрца.

***

У музыки пространство есть?
…Она рождается в душе,
Там, где живёт благая весть.
Без чертежей, без планов, без клише…
Как только в душу проникает свет,
Который возбуждает жизни цвет.

Она по тем законам, что один Всевышний знает,
Вкруг одного другие звуки и тона их собирает,
Выстраивает их – то чинно, благородно,
То озорно, легко, свободно.
И вот она звучит уже...
И торжествует мир!
На вираже
Воображения, реальности, мечты
Витаешь с музыкою ты.
Ты с ней одно едино цело.

Пространство раздвигает перед музыкой пределы –
Чтоб все на свете с нею пело.

***

О, скрипка, контрабас, кларнет и арфа,
Подруги и друзья романса,
Куда бы ваши страсти вас в пути ни завели,
Вы для поклонников звучите страстно,
И не напрасно, а прекрасно,
И не шутя – всегда всерьёз
То ль слёзы милости в нас вызываете,
То ль оживляете фантомы грёз.

*Дзямешка Лілія*

## НЕДАГЛЕДЖАНЫ СОН

Я з той вёскі, дзе доўгія ночы
Не давалі заснуць па зіме,
Дзе параніў балюча аднойчы
Недагледжаны сон пра цябе.

Толькі смутак застаўся на сэрцы,
Толькі боль, які цяжка цярпець,
Толькі слоў не знаходжу пры стрэчы.
Усё сніцца той сон пра цябе.

Вясны новай зара-зараніца…
Цягне ў вёску зноў па зіме
З патаемнай надзеяй:дасніцца
Недагледжаны сон пра цябе.

## РАВЕСНІЦЫ

*прысвячаецца Н. Ляйко*

Мне насустрач ідзе выкладчыца.
Крокам лёгкім, нібы з разбегу.
Для студэнтаў – прафесар, дарадчыца,
Для мяне – сяброўка, калега.

У вачах яе ззяе сонейка,
Яе ўсмешка поўная мараў.
На ёй і сукенка сядзіць годненька
І прычоска ёй вельмі да твару.

Я жадаю ёй прыветліва,
Каб заўжды яе бабіна лета
Было гэткае светлае-светлае,
Маладое было, як вось гэта!

*Зязюліна Дзіяна*

## ВЕСНА

С весной воскресли все мечтанья,
Явились силы, чтобы жить.
Я уловлю его посланье
И постараюсь не забыть.

Налились очи ярким блеском,
Ушли все беды, холода.
И озарились пёстрым блеском
Так долго спавшие луга.

Я наблюдаю измененья
И расцветаю изнутри.
Так долго ждать пришлось мгновенья
Воскресшей с миром новизны.

Я стала меньше видеть грёзы.
В душе моей растоплен лёд.
И не хочу читать стихи и прозу,
В которых был лишь черствый слог.

На небесах теперь нет мрака,
И солнце светит ярче вновь.
Душа моя свободной стала.
Растаяли снега оков.

*Іваноў Мікалай*

# ПРЕСС-МЫСЛИ НА УРОВНЕ ПРОСПЕКТИВНО-ВЕЛИКИХ АФОРИЗМОВ

Топчем души: днем – кому-то, себе – ночью.
Неотшлифованные мечты юности.
Самозабвенно и все забвенно.
Погода такая тихо-теплая и солнечная, что даже самолеты летают стеснительно и боком.
Триады, триады... Три крика на земле: новорожденного, «горько», и предсмертный.
Средний возраст – это губы средней мягкости, шепчущие нежное «люблю».
Юность – это – «Лунная рапсодия».
Зрелость – «Танец с саблями».
Старость – фуги Баха.
В юности чувств и желаний в душе больше, чем слов в лексиконе.
Кто в чем и с чем: кто с собакой на руках, кто с черт-те с чем на голове, один я как дурак со своими умными мыслями.
А для реанимации души нужна весна, даже если на дворе крещенские морозы.
Есть память. Есть сердце. Есть Память у сердца – рубцы.
Диффузия тел, мыслей, желаний.
Скребусь душой.
Форточка в склерозе.
Неуклюжая преданность, влюбленная пристальность.
Крапивные ожоги поцелуев.
Время присело на корточки.
Успеха Вам в этом безнадежном деле.
За дверные ручки анфилады моих дней квазимодный мир цепляется когтями.
Тоскливо. Время застыло в вязкой тоске пустоты.

*Карпей Яўгенія*

# АСЬКІНА ПАДАРОЖЖА, ЦІ ЯК АСЬКА З АКСАМІТАМ ПАСЯБРАВАЛІ

Бусел, якога празвалі Аська, вельмі любіў падарожнічаць. Яго вабіла прыгажосць лясоў і рэк, якіх так шмат у нашай краіне. І вось аднойчы бусел лётаў над Нёманам каля Аўгустоўскага канала. Прыгажосць канала захапляла сваёй жывапіснасцю не толькі Аську, але і ўсіх жыхароў нашай вёскі. Бусел вырашыў паляцець у Белавежскую пушчу, аб якой ён шмат чуў, але яшчэ ніколі там не быў. Птушкі складалі свае песні аб Пушчы, Аська іх слухаў і захапляўся. Ён па-добраму зайздросціў тым, хто на свае вочы бачыў прыгажосць славутай Пушчы.

